ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 12 (1124) ● Чацвер, 1 красавіка 1976 г. ● Цана 2 кап. ● Газета выходзіць з 1935 г.

## РАЗМЕРКАВАННЕ, РАЗМЕРКАВАННЕ...

*Якія хвалюючыя моманты перажываюць у гэты час выпускнікі хімфака. Мінская вобласць, Брэсцкі раён, Гомельскі... Выбар ёсць, але выбраць усё ж такі нялёгка.*

*Зусім, зусім скора будуць здадзены апошнія студэнцкія, цяпер ужо дзяржаўныя экзамены, адзвініць апошні студэнцкі званок і раз'едуцца хлопцы і дзяўчаты па розных кутках Беларусі. Таму і хвалююцца студэнты. Як будзе там, на новым месцы, удалечыні ад дому, якой будзе іх самастойная праца, як складзецца іх будучае жыццё. І хваляванні гэтыя зразумелыя. А таму хочацца пажадаць нашым выпускнікам толькі ўсяго добрага ў іх самастойнай працы і самастойным жыцці.* Фота Т. Петрашкевіч.









# ПАСТАНОВА

## БЮРО КАМІТЭТА КАМСАМОЛА БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА «АБ РАЗГОРТВАННІ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА СПАБОРНІЦТВА ПАД ДЭВІЗАМ «НІВОДНАГА АДСТАЮЧАГА ПОБАЧ» У КАМСАМОЛЬСКАЙ АРГАНІЗАЦЫІ УНІВЕРСІТЭТА

**Рашэнні XXV з'езда Камуністычнай партыі Савецкага Саюза знайшлі гарачы водгук у студэнтаў БДУ. У цяперашні час ва ўсіх студэнцкіх групах арганізавана работа па глыбокаму вывучэнню матэрыялаў з'езда, якая дазваляе студэнтам вызначыць сваё месца ў працэсе выканання планаў дзесятай пяцігодкі. Значныя перспектывы, якія адкрыў перад усім савецкім народам XXV з'езд, ставяць і перад студэнтамі універсітэта новыя задачы, у вырашэнні якіх мы павінны зыходзіць з дасягнутага.**

**Разгарнуўшы спаборніцтва за права падпісаць Рапарт Ленінскага камсамола XXV з'езду КПСС, камсамольская арганізацыя універсітэта дабілася пэўных поспехаў у сваёй дзейнасці. 1389 камсамольцаў універсітэта вучацца толькі на «выдатна», 4314 — на «добра» і «выдатна». Больш сямі тысяч студэнтаў займаюцца навуковай дзейнасцю. 418 лепшых камсамольцаў паставілі свае подпісы пад Рапартам XXV з'езду КПСС.**

**Разам з тым бюро камітэта камсамола адзначае, што камсамольская арганізацыя універсітэта мае яшчэ значныя рэзервы і магчымасці для павышэння паспяховасці (у зімовую сесію 675 камсамольцаў БДУ атрымалі нездавальняючыя адзнакі; 268 — займаюцца толькі на «здавальняюча»), актывізацыі студэнцкай навукова-даследчай работы, павышэння ідэйна-палітычнай дзейнасці студэнтаў.**

**У дзесятай пяцігодцы мы павінны дабіцца таго, каб кожны камсамолец пастаянна паглыбляў свае веды, выпрацоўваў навыкі даследчыка, расшыраў палітычны кругагляд.**

**Сённяшні студэнт — гэта заўтрашні спецыяліст, кіраўнік працоўнага калектыву. У першую чаргу трэба зрабіць так, каб у кожнай групе было створана становішча ўзаемадапамогі, таварыскай непрымірымасці да праяўленняў ляноты, бесхарактарнасці. Камсамольская прынцыповасць не можа суседнічаць з фармалізмам і няякаснасцю ведаў.**

**У Справаздачы ЦК КПСС XXV з'езду партыі Генеральны сакратар ЦК КПСС Л. І. Брэжнеў гаварыў: «Важна, таварышы, каб ні адзін добры пачын не заглох. Некалькі гадоў таму назад на прадпрыемствах Горкага ўзнік заклік: «Ніводнага адстаючага побач!» Гэта быў не толькі вытворчы лозунг, але і маральная норма. Спачатку ён быў шырока падхоплен, але, на жаль, у гэты момант дзе-нідзе забыт. Але ж яго шырокае распаўсюджанне можа даць важныя для ўсёй краіны вынікі».**

**Словы Л. І. Брэжнева знайшлі гарачы водгук у студэнтаў нашага універсітэта. Камсамольцы факультэта прыкладной матэматыкі, філалагічнага, фізічнага, хімічнага факультэтаў звярнуліся да ўсіх студэнтаў з заклікам разгарнуць спаборніцтва пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!»**

**Зыходзячы з вышэй сказанага, бюро камітэта камсамола універсітэта пастанаўляе:**

**1. Адобрыць ініцыятыву камсамольцаў ФПМ, філалагічнага, фізічнага, хімічнага факультэтаў па разгортванню сацыялістычнага спаборніцтва паміж камсамольскімі групамі пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!»**

**2. Спаборніцтва павінна аказаць дзейсную дапамогу камсамольскаму актыву ў стварэнні такога становішча ў кожнай арганізацыі, каб ні адзін камсамолец не быў у баку ад спраў сваёй групы, садзейнічаў поспехам таварышаў. Мы можам і павінны дабіцца таго, каб ні ў адной акадэмічнай групе не было непаспяваючых. Задача гэта рэальная і нашым камсамольскім арганізацыям пад сілу.**

**3. Камітэтам камсамола факультэтаў, бюро камсамольскіх арганізацый акадэмічных груп вывучыць гэтую пастанову і распрацаваць канкрэтныя мерапрыемствы сацыялістычнага спаборніцтва пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!»**

**4. Даручыць ідэалагічнаму аддзелу камітэта камсамола арганізаваць шырокае асвятленне ходу спаборніцтва ў газеце «Беларускі універсітэт», насценным друку.**

**5. Вынікі спаборніцтва падводзіць два разы ў год пасля кожнай сесіі. Аддзелу вучэбнай і навуковай работы распрацаваць да 15 красавіка 1976 года сістэму заахвочванняў пераможцаў.**

**6. Аддзелу вучэбнай і навуковай работы камітэта камсамола універсітэта падрыхтаваць тэкст звароту да ўсіх студэнтаў рэспублікі з заклікам уключыцца ў спаборніцтва пад дэвізам «Ніводнага адстаючага побач!»**

## ПАВЫСІЦЬ УЗРОВЕНЬ АБАРОННА-МАСАВАЙ РАБОТЫ

Фінішаваў месячнік абаронна - масавай работы, які прысвячаўся 58-й гадавіне Савецкай Арміі і Ваенна - Марскога Флоту. У гэтым годзе ён праходзіў ва ўмовах вялікага палітычнага і працоўнага ўздыму, выкліканага падрыхтоўкай і работай XXV з'езда КПСС.

У ходзе месячніка ва універсітэце праведзена вялікая работа па ваенна-патрыятычнаму выхаванню студэнтаў і супрацоўнікаў універсітэта. Праведзены спаборніцтвы па ваенна - прыкладных відах спорту на факультэтах і ў маштабе універсітэта.

Усяго праведзена:

17 тэматычных вечароў, 60 сустрэч з героямі і ветэранамі вайны, 24 паходы, 5 канферэнцый чытачоў, прачытана 420 лекцый, дакладаў, 2060 чалавек наведалі музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны. У спаборніцтвах па ваенна-прыкладных відах спорту прынялі ўдзел каля 1800 чалавек. Падрыхтавана больш за 100 спартсменаў-разраднікаў, 260 радыётэлеграфістаў, 31 шафёр-любіцель.

Створаны і працуюць гурткі па падрыхтоўцы парашутыстаў, радыётэлеграфістаў і шафёраў-любіцеляў.

Па выніках месячніка абаронна - масавай работы арганізацыя ДТСААФ універсітэта заняла 2-е месца сярод арганізацый ДТСААФ ВНУ горада.

Лепшымі арганізацыямі ДТСААФ па выніках работы ў перыяд месячніка прызнаны арганізацыі:

біялагічнага факультэта (старшыня камітэта ДТСААФ М. Марозік. Актывісты ДТСААФ — Е. Саломенік, А. Лярскі, А. Казулін. Камітэт ДТСААФ факультэта працуе ў цесным кантакце з камітэтам камсамола і атрымлівае пастаянную дапамогу з боку партыйнага бюро і дэкана А. Пікулева);

хімічнага факультэта (старшыня камітэта ДТСААФ А. Бабаеўскі, адказны ў партбюро за абаронна - масавую работу Н. Рафальскі. На факультэце склаліся добрыя традыцыі ў арганізацыі і правядзенні абаронна - масавай работы. Умела плануецца і праводзіцца работа ветэранаў вайны. Трэба асабіста адзначыць дзейнасць палкоўніка у адстаўцы Ф. Церашонка. Партыйнае бюро і дэканат удзяляюць шмат увагі рабоце арганізацыі ДТСААФ факультэта);

гістарычнага факультэта (старшыня камітэта ДТСААФ В. Мядзянік. На факультэце добра аформлена наглядная агітацыя па ваенна - патрыятычнаму выхаванню. Шмат увагі дзейнасці арганізацыі ўдзяляюць дэкан І. Царук і сакратар партыйнага бюро факультэта І. Марчанка. Усё ж у рабоце камітэта ДТСААФ ёсць яшчэ істотныя недапрацоўкі, асабліва ў стралковым спорце).

Ніжэй сваіх магчымасцей працавалі арганізацыі геаграфічнага факультэта (старшыня камітэта Н. Курловіч) і юрыдычнага факультэта (старшыня камітэта Э. Анапрыенка). У гэтых арганізацыях камітэты ДТСААФ працавалі ў адзіночку, без апоры на актыў, адсутнічала сувязь іх з камсамольскімі арганізацыямі факультэтаў.

Зараз адна з нашых першачарговых задач заключаецца ў тым, каб разгарнуць шырокую прапаганду рашэнняў XXV з'езда КПСС, якія накіраваны на ўзмацненне эканамічнай і абароннай магутнасці нашай Радзімы, забяспечыць новы размах сацыялістычнага спаборніцтва і на гэтай аснове павысіць узровень абаронна - масавай работы.

М. ГАРЛАТАЎ.

● У ВНУ КРАІНЫ

## АЎТАМАТЫКА Ў АЎДЫТОРЫІ

Першая аўтаматызаваная лекцыйная аўдыторыя на 86 месц, якая абсталявана на фізічным факультэце ЛДУ, гатова прыняць студэнтаў.

Там, дзе ў звычайных аўдыторыях знаходзіцца кафедра для лектара, размешчан пульт кіравання і блок праграм. Перад пачаткам заняткаў кіна- і фотаматэрыялы, якія выкладчык будзе выкарыстоўваць на лекцыі, тэхнік, які абслугоўвае аўдыторыю, змесціць у праектары. Паслядоўнасць дэманстрацыі ён закадзіруе ў блоку праграм. Далей усё прасцей: у той момант, калі выкладчыку трэба будзе паказаць дыяфільм, дыяпазітыў або ўрывак з кінафільма, яму застанецца націснуць патрэбную кнопку на пульце кіравання або на спецыяльнай указцы. Падпарадкоўваючыся закладзенай праграме, аўтаматыка ўключыць неабходную прыладу.

На гэтым дыяпазон аперацый, якія можна праводзіць пры дапамозе пульта, не абмяжоўваецца. Выкладчык, напрыклад, за пяць-дзесяць хвілін мае магчымасць апытаць кожнага з 86 студэнтаў, якія займаюцца ў аўдыторыі, даведацца, як студэнты засвоілі пройдзены матэрыял, ці добра падрыхтаваліся да заняткаў.

**(«Ленинградский университет», ЛДУ).**

## ПА БДУ

*⊙ 29 сакавіка ў зале паседжанняў саветаў БДУ адбылося сумеснае паседжанне савета, парткома, мясцкома, камітэта камсамола і прафкома БДУ імя У. І. Леніна. З дакладам «Аб задачах калектыву універсітэта па выкананню рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ выступіў рэктар універсітэта прафесар У. М. Сікорскі.*

*⊙ 30 сакавіка адбылася нарада актыву універсітэта па абаронна-масавай рабоце. З дакладам «Аб стане абаронна - масавай работы і мерах па яго паляпшэнню ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС і XXVIII з'езда КПБ» выступіў начальнік ваеннай кафедры Б. М. Глазкоў. На нарадзе выступілі: прарэктар па вучэбнай рабоце У. Р. Івашын, старшыня камітэта ДТСААФ М. В. Гарлатаў, намеснік старшыні камітэта ветэранаў Вялікай Айчыннай вайны пры БДУ А. С. Мізрахі і намеснік сакратара камітэта камсамола універсітэта В. Андруховіч.*




**«Мы, савецкія камуністы, лічым абарону пралетарскага інтэрнацыяналізму святым абавязкам кожнага марксіста-леніінца».**

*(З даклада Генеральнага сакратара ЦК КПСС тав. Л. І. Брэжнева на XXV з'ездзе КПСС).*

# У В'ЕТНАМСКІХ СТУДЭНТАЎ—СВЯТА

Нядаўна ў БДУ праходзіў Тыдзень савецка-в'етнамскай дружбы, які прысвячаўся 45-годдзю з дня ўтварэння Саюза працоўнай моладзі В'етнама імя Хо Шы Міна. Тыдзень пачаўся з адкрыцця выстаўкі карцін і малюнкаў в'етнамскіх студэнтаў. Асноўная тэма іх твораў — сучаснае жыццё, пейзажы нашай сталіцы, прырода.

У праграму Тыдня савецка-в'етнамскай дружбы ўваходзілі сустрэчы членаў в'етнамскага зямляцтва з савецкімі студэнтамі, членамі нямецкага, чэхаславацкага зямляцтваў; на працягу Тыдня праходзілі спаборніцтвы па тэнісу і шахматах паміж студэнтамі механіка - матэматычнага факультэта і в'етнамскім зямляцтвам, былі паказаны мастацкія кінафільмы. Для в'етнамскіх студэнтаў быў арганізаван урачысты святочны вечар.

Закончыўся Тыдзень савецка - в'етнамскай дружбы падпісаннем дагавору аб супрацоўніцтве механіка - матэматычнага факультэта і в'етнамскага зямляцтва.

*Студэнтаў трох ВНУ горада сабраў Тыдзень савецка-в'етнамскай дружбы ў актавай зале інстытута народнай гаспадаркі імя В. Куйбышава. Тут адзначаўся юбілей— 45-годдзе з дня ўтварэння Саюза працоўнай моладзі В'етнама імя Хо Шы Міна. Залу запоўнілі студэнты з БДУ, БПІ і БІНГ. Лейтматыў выступленняў юбіляраў, гаспадароў і гасцей вечара — няхай мацнее дружба паміж савецкім і в'етнамскім народамі, моладдзю краін.*

*Сакратар мінскай гарадской арганізацыі Саюза працоўнай моладзі В'етнама імя Хо Шы Міна, аспірант Бінг Чыонг Монг Лам расказаў аб гісторыі ўтварэння і дзейнасці Саюза.*

*З трыбуны прагучалі віншаванні з юбілеем прадстаўнікоў універсітэта, політэхнічнага інстытута, мінскага камвольнага камбіната, інстытута народнай гаспадаркі.*

*Беларускія, рускія, в'етнамскія мелодыі перапляліся на вялікім канцэрце, якім заканчваўся вечар. Асаблівай папулярнасцю карыстаўся вакальна - інструментальны ансамбль в'етнамскіх студэнтаў.*

# СЯБРОЎСКАЯ СУСТРЭЧА

26 сакавіка студэнты гістарычнага факультэта БДУ сустракаліся з групай французскіх студэнтаў-політэхнікаў з горада Бардо.

— Гэта ўжо другая сустрэча студэнтаў гістфака з замежнымі студэнтамі, — гаворыць адзін з ініцыятараў вечара выкладчык Уладзімір Васільевіч Кузьмінаў. — Такія сустрэчы прыносяць двухбаковую карысць. Для нашых студэнтаў, напрыклад, гэта перш за ўсё магчымасць праверыць свае сілы ў вывучаемай замежнай мове. Зносіны маладых людзей розных краін, калі яны выліваюцца ў сапраўднае свята, дыспуты, гутаркі — і ўсё гэта ў абсалютна простай атмасферы, з пачуццём дружбы і ўзаемнай сімпатыі, — такія зносіны самі па сабе цудоўныя.

Я размаўляю з кіраўнікам групы французскіх студэнтаў Аленам Планем. Ален — член Камуністычнай партыі Францыі, актывіст прафсаюзнага руху.

— Нас 50 чалавек. Усе з групы знаходзяцца ў Савецкім Саюзе першы раз. Асабіста я — у другі. Паездка па Савецкаму Саюзу дае сапраўднае ўяўленне аб вашым ладзе жыцця. Сёння днём мы сустракаліся з рабочымі гадзіннікавага завода. Засталіся вельмі прыемныя ўражанні. Нашы студэнты ўсё больш пераконваюцца ў тым, што Савецкая краіна — краіна вялікага і светлага дня.

**У. САЛАСЮК.**





**На выстаўцы твораў двух таленавітых в'етнамцаў Буй Дзінь Кхоя і Нью Ань прадстаўлены далёка не ўсе іх карціны. Але ўжо па іх бачна, да чаго тонка разумее ўсё багацце і хараство беларускай прыроды в'етнамскі хлопец! Пад яго пэндзлем ажывае, цячэ халодная зімовая вада ракі Свіслач, у задуменні схілілася над ёй прыцярушаная снегам вярба.**

**Галоўная тэма твораў Нью Ань — чалавек і яго свет. Самыя маленькія штрышкі, якія прыкмячае дзяўчына, дапамагаюць бліжэй пазнаць нашага сучасніка, раскрываюць ягоны характар.**

**Натуральнасць і разуменне прыгожага — якасці, уласцівыя маладым мастакам, студэнтам з В'етнама.**

Фота М. Нечыпарэнкі.

# ЛЮДЗІ НОВАЙ АФРЫКІ

Афрыка... Гулкія ўдары тамтамаў. Крытыя пальмавым лісцем хаціны. Чарнаскурыя атлеты-негры, расфарбаваныя, з каляровай татуіроўкай. Рытуальныя скачкі вакол абімшэлых ідалаў. Такой паўстае яна на старонках прыгодніцкіх кніг, на кінаэкранах. З маленства гэты кантынент уяўляецца як нешта незвычайнае, экзатычнае, ад чаго павявае таямнічым ветрам стагоддзяў, першабытнасцю, дзяцінствам чалавецтва.

А гэтыя хлопцы ў еўрапейскіх касцюмах свабодна размаўляюць на рускай мове, любяць Пушкіна і Горкага, Лермантава і Шолахава.

І гэта таксама Афрыка, новая Афрыка, што ўздымае ў блакіт трапічнага неба гмахі заводскіх карпусоў, утаймоўвае плацінамі дзікую імклівасць афрыканскіх рэк, пракладвае скрозь гарачыя пяскі пустынь чыгуначныя рэйкі.

...Зямля Афрыкі была калыскай самых старажытных цывілізацый планеты. Гіганцкія рабаўладальніцкія дзяржавы, росквіт рамёстваў і культуры... Зараз толькі суровыя піраміды і статуі маўклівых сфінксаў захоўваюць памяць тых далёкіх часоў.

Эпоха вялікіх геаграфічных адкрыццяў прынесла Афрыцы шмат гора і пакут. Над кантынентам навісла чорная цемра каланізацыі. Міналі стагоддзі, чалавецтва ішло ўперад, набывала веды, удасканальвала тэхніку і грамадскі лад, — а тут час нібы спыніўся, застыў, стаў нерухомым, як паветра трапічнага поўдня, распаленае шалёным сонцам.

І вось зараз Афрыка, зварушаная, абуджаная ад векавога сну, выходзіць на дарогу сацыяльна - эканамічнага прагрэсу. Рвуцца ланцугі няволі — яны не ў сілах стрымаць гэты магутны поступ. Старажытны кантынент перажывае сваё другое нараджэнне. Наперадзе — вялікі шлях, вялікія задачы...

Так пачалі свой расказ пра родную зямлю малійскія філолагі, будучыя выкладчыкі рускай мовы, якія праходзяць зараз стажыроўку ў нашай краіне. 25 сакавіка яны былі запрошаны на сустрэчу са студэнтамі факультэта журналістыкі.

Гэта была незвычайная сустрэча — шчырая, без афіцыйных фраз. Ішла добрая сяброўская размова пра ўсё, што было цікава: пра тое, што ў малійскіх школах дваццацібальная сістэма адзнак; што ў аднаго з гасцей налічваецца ні мала, ні многа — дваццаць пяць братоў і сясцёр; тое, што малійскія стажоры толькі пасля прыезду ў Савецкі Саюз даведаліся, напрыклад, што такое фігурнае катанне.

Моўнага бар'еру не існавала, бо ўсе госці выдатна гаварылі па-руску. Акрамя таго, яны старанна падрыхтаваліся да сустрэчы: размеркавалі тэмы выступленняў, выпісалі цікавыя лічбы, зрабілі кароткія канспекты.

Адзін расказаў пра гісторыю Малі, другі — аб традыцыях яе народа, трэці — пра карэнныя змены ў жыцці краіны пасля набыцця незалежнасці... Шмат даведаліся слухачы пра эмансіпацыю малійскай жанчыны, пра сістэму адукацыі, пра новую канстытуцыю, прынятую ў мінулым годзе.

Прыводзяцца лічбы. Яны ўражваюць: усяго пятнаццаць гадоў незалежнасці — і такі значны прагрэс! Малійцы падкрэсліваюць, што поспехі ва ўсіх галінах — у сферы эканомікі, культуры, адукацыі — дасягнуты дзякуючы вялікай брацкай дапамозе Савецкага Саюза і іншых сацыялістычных краін. Савецкія трактары, савецкія спецыялісты, савецкія выстаўкі і кнігі... Дарэчы, пра кінаэпапею «Вызваленне» малійскія госці адазваліся вельмі цёпла. Магчыма, таму, што тэма вызвалення — самая хвалюючая, самая надзённая тэма сучаснай Афрыкі. Сённяшні дзень Чорнага кантынента — гэта цяжкая барацьба за вызваленне з-пад прыгнёту неакаланіялізму, за эканамічную і палітычную незалежнасць.

Гэтыя маладыя вучоныя-філолагі — яскравае сведчанне тых неабдымных творчых, інтэлектуальных сіл, што дрэмлюць у афрыканскім народзе. Народ з такімі вялікімі патэнцыяльнымі магчымасцямі нагадвае сціснутую спружыну. Яна ўжо пачала распрамляцца, і яе каласальная энергія змятае на сваім шляху ўсе перашкоды.

...Сустрэча закончана, уручаны сувеніры.

— О рэвуар, камарад! — развітваемся мы.

— Да пабачэння, таварышы! — усміхаюцца малійцы.

**А. КЛАСКОЎСКІ,**
**студэнт журфака.**





**НА ЗДЫМКАХ:** будучыя малійскія філолагі на сустрэчы са студэнтамі факультэта журналістыкі.

Фота А. Басава і А. Барысевіча.

# ЗА ЎЗОРНЫ БЫТ

ЦІКАВЫЯ СУСТРЭЧЫ

## РЭПЕРТУАР ДЛЯ МОЛАДЗІ

З лаўрэатам рэспубліканскага конкурсу дэкламатараў, майстрам мастацкага слова М. Казініным мы сустрэліся ў інтэрнаце № 5, дзе ён даваў канцэрт студэнтам фізічнага факультэта нашага універсітэта, і задалі яму некалькі пытанняў.

— Мікалай Рыгоравіч, хто Ваш любімы паэт?

— Ведаеце, рабяты, аднаго паэта назваць, бадай што, немагчыма. З вялікай асалодай чытаю вершы Раждзественскага, Вазнясенскага і Еўтушэнкі. Іменна яны, на мой погляд, ускалыхнулі паэзію, абагацілі яе новым зместам, прымусілі слухаць шматмільённую аўдыторыю.

— Скажыце, калі ласка, што Вы ўключаеце ў свой рэпертуар і дзе вы выступаеце?

— У маім рэпертуары — вершы Ясеніна і Маякоўскага, творы сучасных паэтаў. У хуткім часе я закончу падрыхтоўку да вечара рускага класічнага апавядання, у рэпертуар якога ўключаны апавяданні Чэхава, Талстога, Буніна і іншых класікаў. Па творах Раждзественскага і Еўтушэнкі намячаецца даць 200—300 канцэртаў.

— Толькі што Вы чыталі цыкл вершаў Гамзатава...

— Так, вершы і прозу Гамзатава я люблю. У той час як я знаём з многімі паэтамі, вершы якіх я чытаю, з Гамзатавым мне сустрэцца не давялося, хоць і была такая шчаслівая выпадковасць...

У асноўным мая праграма разлічана на моладзь. Гэта публіка самая непасрэдная, якая рэагуе на кожную жывую думку. Выступаю ў вясковых школах, у ВНУ і тэхнікумах.

— Мікалай Рыгоравіч, а як Вы адносіцеся да маладых паэтаў і іх творчасці?

— Ведаеце, гэта складанае пытанне. Я з цікавасцю сачу за кожным новым паэтам, але, на жаль, часам расчароўваюся. Паэзія бывае шэрая і нецікавая, бяззубая паэзія, калі можна так сказаць. «Ціхая паэзія», як назваў яе Еўтушэнка. Чаго не хапае пачынаючым паэтам? Бадай што, грамадзянскага пафасу.

— Традыцыйнае пытанне: фізік ці лірык?

— Я лічу, што няма сэнсу ставіць такое пытанне. Я сустракаўся з фізікамі, якія значна ярчэй і глыбей успрымаюць паэзію, чым некаторыя лірыкі.

**Л. КОПАЦЬ,**
**студэнтка журфака.**
**П. САМОЙЛА,**
**студэнт фізфака.**





*Высока ў неба ўзнёсся будынак-прыгажун інтэрната № 2 па вуліцы Кастрычніцкай. Арыгінальная архітэктура, інтэр'ер, светлыя, добра абсталяваныя памяшканні і чытальныя залы—усё гэта найлепшым чынам стварае такія ўмовы, якія дазваляюць кожнаму жыхару назваць інтэрнат сваім домам. У чыстых, сонечных пакоях інтэрната жывуць будучыя географы, журналісты, хімікі, біёлагі.*

*Фота М. ЧАЛЕЯ, В. ДРАЧОВА.*

КАРЦІНА ПЕРШАЯ

— Ну што, патанцуем? — выдыхнуў хлопец з памятым заспаным тварам, у спартыўным касцюме, у хатніх тапках на босую нагу. У адказ — здзіўленыя, збянтэжаныя вочы дзяўчыны. А «партнёр» ужо цягнуў яе праз чыесьці рукі, ногі... Такой нахабнасці яна не чакала. Вырвалася і ў роспачы кінулася ў дзверы.

— Вось дзівачка, — прахрыпеў «сучасны прынц» і ў момант падхапіў другую, і яны пачалі выбрыкваць, прама скажам, цуды...

КАРЦІНА ДРУГАЯ

У памяшканні «чыталкі» — паўзмрок. Ні то зверху, ні то знізу «раве ды стогне» магнітафон. А людзей жа, людзей, як камсы ў бочцы! І кожны імкнецца адбіць сабе пабольш месца, каб даць волю і нагам, і рукам. Некатарыя «працуюць» яшчэ з музыкай у такт, а многія даўно з яго выбіліся і танцуюць па прынцыпу «хто як можа».

Гэта—вечар «адпачынку» ў студэнцкім інтэрнаце. Пасля яго ўдзельнікі з потнымі тварамі ледзь цягнуць ногі да сябе ў «нумар» і там, знясіленыя, завальваюцца спаць да абеду заўтрашняга дня. Нездарма «вечары» праводзяцца толькі ў суботу.

Ну, з назвай вечара ўсё ясна, а вось рэпертуар... Танцы, танцы, танцы... Разнастайныя? Не тут-та было! Толькі так званыя «хуткі» і «павольны». Шматабяцаючыя назвы... З «хуткім» мы з вамі ўжо пазнаёміліся. Ну, а «павольны» — гэта яшчэ прасцей. Пасля «хуткага» патрэбен адпачынак. І вось майстэрства «павольнага» ў тым і заключаецца, што партнёры пад ціхае завыванне музыкі адпачываюць у лёгкім паўсне на плячах адзін у аднаго. Пры гэтым можна, у залежнасці ад жадання, перамінацца з нагі на нагу.

## ШТО, ДЗЕ І ЯК МЫ ТАНЦУЕМ

ПАГАВОРЫМ СУР'ЁЗНА

Будзе банальна ўспамінаць зараз першы баль Наташы Ростовай. Але перад вачыма — хочаш не хочаш — усплывае танец ва ўсёй сваёй прыгажосці: лёгкасць рухаў, плаўнасць, меладычнасць, што так рэдка ўбачыш сёння. А я зайздрошчу ёй. У Наташы з дзяцінства выхоўвалі любоў да танца, вучылі яго майстэрству. Вальс, танга, мазурка... Які разнастайны выбар. Не, я не хачу сказаць, што ў нас няма школ бальнага танца. Яны існуюць. А ці ходзяць туды заўзята моладзь, студэнты? Калі на факультэтах нашага універсітэта праводзілася апытанне, хто наведвае танцавальныя школы, выявілася — адзінкі. У чым прычына? «Лагічнае» апраўданне некаторых: навошта вучыцца майстэрству вальса, танга, калі прыходзіш на танцы, а там укараніліся толькі «павольныя» і «хуткі», якія не патрабуюць асаблівага майстэрства.

Што гэта, нежаданне прыгожа танцаваць?

Зноў звяртаюся да Талстога. Чаму сотні гадоў назад уменне танцаваць уваходзіла ў этыкет чалавека? Чаму гады рассеялі любоў да танца?

Разумею, атамны век, век хуткасцей. Я не супраць шэйка. Але дзе ж яна, прыгажосць танца? Няма, бо няма ўмення.

Цяжка зараз, так, адразу, знайсці вырашэнне гэтай праблемы. А яна хвалюе многіх, найбольш — кіраўнікоў культурна-масавых сектараў.

Дадзім ім слова.

**Людміла ЦІХАН, геаграфічны факультэт:**

— Мы не супраць танцаў. Але пры арганізацыі любога мерапрыемства ў нашым інтэрнаце № 2 заўсёды сутыкаешся з тым, што гэта мерапрыемства няма дзе праводзіць. Жыве ў інтэрнаце больш тысячы чалавек, а вось калі яго будавалі, не задумаліся, дзе будуць адпачываць жыхары. Умелая арганізацыя вечароў адпачынку залежыць таксама і ад самога кіраўніцтва. Хочацца, каб мерапрыемствы рыхтавалі кіраўнікі ўсіх чатырох факультэтаў інтэрната.

**Іван КУКСА, факультэт журналістыкі:**

— Да нядаўняй пары студэнты нашага факультэта праводзілі свае вечары ў памяшканні... буфета. Але зараз ён працуе. І пытанне памяшкання для адпачынку ў інтэрнаце № 2 застаецца адкрытым.

Зразумела, культмасавая работа не заключаецца толькі ў тым, каб правесці той ці іншы вечар. Яна вельмі мнагагранная. Тут яшчэ і сустрэчы з цікавымі людзьмі, абмеркаванне новых кніг, фільмаў, правядзенне дыспутаў і г. д. А дзе гэта ўсё праводзіць?

Пачаткам вырашэння праблемы павінен быць пошук месца адпачынку. Мая прапанова: адрамантаваць і абсталяваць падвальнае памяшканне. Плошча яго не малая. Некалькі суботнікаў, дружная праца ўсіх студэнтаў і... калі ласка!

**Алена ГАРБАЦЮК, хімічны факультэт:**

Не хочацца паўтарацца і многа гаварыць аб недахопах. Усе мы добра іх бачым. Іншая справа — як іх выправіць.

— Я — за культуру вечароў, за майстэрства і прыгажосць танца. Але адно — звальваць усю віну на кіраўніцтва, другое — самому прымаць актыўны ўдзел у справе, якая хвалюе нас усіх. Ніхто не павінен быць у баку. А радыёвузел, які я прапаную арганізаваць, адыграў бы, на мой погляд, значную ролю ў падрыхтоўцы ўсіх мерапрыемстваў.

Такім чынам, пытанне застаецца адкрытым. Яго вырашэнне залежыць ад нас саміх.

«Інтэлігентны чалавек. Гэта адказнае слова. Гэта так глыбока і сур'ёзна, што патрэбна часцей самому думаць пра адказнасць за гэта слова», — так гаварыў В. Шукшын.

**А. ХАРЛАМАВА.**

ІНТЭРВ'Ю НУМАРА

**Інтэрнат пачынаецца з вахцёраў. Звычайна мы не заўважаем, што, прайшоўшы да сябе ў пакой міма чалавека, які нясе службу за вахцёрскім столікам, мы пераступаем грань, за якой уступаюць у сілу тыя законы і правілы сацыялістычнага агульнага жыцця, якія абавязковы для кожнага жыхара. Мы пераступаем гэту грань штодзённа па некалькі разоў, і кожны раз нас сустракае строгі і ўважлівы позірк вахцёра.**

**Мы паставілі мэтай устанавіць, як жа паводзіць сябе студэнцкая маса, пераступаючы парог свайго інтэрната. Агульнавядома, што лепш за ўсіх маюць аб гэтым уяўленне вахцёры інтэрната. Прадастаўляем ім слова.**

## ІНТЭРВ'Ю ДАЮЦЬ ВАХЦЁРЫ

— Наша работа? Работа не з лёгкіх. Самі разумееце — справу маем з масай студэнтаў. Нервы патрэбны, уменне звяртацца да людзей, павага да кожнага... — гэта гаворыць **А. М. Рубанава, вахцёр інтэрната № 6.**

Ва ўсіх іншых інтэрнатах на гэтае пытанне нам адказалі амаль такімі ж словамі.

— У нас жывуць добрыя студэнты, культурныя. Нам вельмі дапамагае студсавет. Ды і самі рабяты дзяжураць з задавальненнем, — расказвае **С. Ф. Шаціла, вахцёр інтэрната № 8,** чалавек з вялікім жыццёвым вопытам. — Не памятаю, каб былі якія-небудзь інцыдэнты...

**А вось мы ў інтэрнаце № 1. За вахцёрскім столікам — І. І. Палешчучэнка:**

— Я тут усяго паўтара года працую. Што можна сказаць? Уражанне студэнты выклікаюць добрае. У мінулым годзе, у Дзень Перамогі, рабяты з аператыўнага атрада літаральна не далі мне дзяжурыць. «Ідзіце, — гавораць, — Іван Іванавіч, адпачніце, свята ж вялікае, а для ветэранаў — асабліва». Вось якія малайцы. Як з пропускамі? Ну, я сваіх студэнтаў усіх у твар ведаю. Добрыя рабяты. Жыхары інтэрната ў ідэале? Такія, як нашы студэнты - гісторыкі. Здароўя ім і доўгіх год жыцця...

— Як бы ні спяшаліся на заняткі, а без «Добрай раніцы» ніхто міма не праходзіць. Ветлівыя студэнты жывуць у нас на Паркавай, — словы **К. С. Янкоўскай, вахцёра інтэрната № 4.**

**19 гадзін 30 мінут. У інтэрнаце № 7 вельмі людна. Тут жывуць больш як паўтары тысячы студэнтаў універсітэта. Заканчваецца другая змена дзяжурства. Знаёмімся з вахцёрам В. Ф. Маёравай. Два з палавінай гады працуе тут.**

— Студэнты пропуск не хочуць паказваць. Запатрабуеш — часам грубіяніць пачнуць. Некаторыя не ўтаюцца, спазняюцца... Дзяжурства не заўсёды арганізавана як належыць. Інцыдэнты? Вось нядаўна адзін п'янчужка спрабаваў прайсці па чужому пропуску. Гляджу: на фота — дзяўчына, косы доўгія... Гляджу на «студэнта» — валасы, праўда, таксама доўгія, але без кос, твар шчаціннем зарос. І такое бывае. Калі рацей, праца цяжкая, нервы патрэбны. Жывые хто? Філолагі, фізікі...

**Н. І. Шышкавец, вахцёр інтэрната № 2:**

— Некаторыя студэнты чамусьці лічаць, што дастаткова адзін раз прайсці па пропуску, каб потым яго ўжо і не вынімаць з кармана, а то і ўвогуле не насіць з сабой. Запатрабуеш пропуск — ці крыўдзяцца, ці, бывае, такую выкажуць незадаволенасць, што і вітацца перастануць. А народу ж жыве шмат, хіба ўсіх запомніш у твар? Якія пажаданні? Хацелася б, каб кожны студэнт быў больш чулы і паважаў акружаючых яго людзей, не гаворачы ўжо аб простым захоўванні такту...

**У слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, якія жывуць у асноўным у інтэрнаце № 3, — канікулы. На лесвічных пляцоўках і паверхах стаіць цішыня.**

— Тут, вось на гэтым месцы, — расказвае вахцёр **А. І. Казлова,** — я працую ўжо трынаццаць гадоў. З усіх, хто жыў тут, мне больш за ўсіх падабаюцца цяперашнія жыхары — слухачы падрыхтоўчага аддзялення. Сур'ёзныя, ветлівыя хлопцы і дзяўчаты, парадак любяць, чысціню. Сваё дзяжурства вельмі строгае арганізавалі. Адным словам, будуць узорнымі студэнтамі. Вы з нашай газеты? Калі будзеце пісаць пра вахцёраў, прынясіце, калі ласка, мне газету. Тыя нумары, якія да мяне папада юць, я усё «да нітачкі» перачытваю...

**Усё сказанае вышэй як нельга лепш пацвярджаюць тыя вынікі месячніка-агляду жыллёва-бытавых умоў і культурных паводзін студэнтаў — жыхароў інтэрнатаў—падвядзенне якіх адбылося месяц назад: студсаветам інтэрнатаў трэба яшчэ больш удзяляць увагі эстэтычнаму выхаванню студэнтаў, павышэнню іх культурнага ўзроўню, больш вучыць зносінам з людзьмі, кантролю за сваімі паводзінамі.**

**В. САДОЎСКІ,**
**А. НІКАЛАЙЧЫК,**
**студэнты журфака.**



# КРАСАВІЦКІ КАЛЯНДАР

1 — 100 гадоў з дня нараджэння Р. С. Зямлячкі (Самойлавай) (1876—1947), савецкага партыйнага і дзяржаўнага дзеяча.

**4 — ДЗЕНЬ ГЕОЛАГА.**

**4 — 1945** — Дзень вызвалення Венгрыі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Венгерскае нацыянальнае свята.

5 — 80 гадоў з дня пачатку (1896) першых сучасных Алімпійскіх гульняў.

**7 — СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ ЗДАРОЎЯ.**

11 — 40 гадоў з дня адкрыцця (1936) X з'езда ВЛКСМ.

**11 — ДЗЕНЬ ВОЙСК ПРОЦІПАВЕТРАНАЙ АБАРОНЫ КРАІНЫ.**

12 — 15 гадоў назад (1961) касмічны карабель «Восток», які пілатаваў лётчык-касманаўт Ю. А. Гагарын, здзейсніў першы ў свеце арбітальны касмічны палёт.

**12 — ДЗЕНЬ КАСМАНАЎТЫКІ.**

16 — 90 гадоў з дня нараджэння Эрнста Тэльмана (1886—1944), дзеяча нямецкага і міжнароднага камуністычнага і рабочага руху.

22 — нарадзіўся Уладзімір Ільіч Ленін.

23 — 80 гадоў з дня нараджэння Матэ Залкі (1896—1937), венгерскага пісьменніка, героя грамадзянскай вайны ў СССР і нацыянальна-рэвалюцыйнай вайны ў Іспаніі.

**24 — МІЖНАРОДНЫ ДЗЕНЬ САЛІДАРНАСЦІ МОЛАДЗІ.**

**25 — СУСВЕТНЫ ДЗЕНЬ ПАРОДНЕНЫХ ГАРАДОЎ.**

## ЗАПРАШАЕМ НА ФЕСТЫВАЛЬ!

У суботу, 3 красавіка, у 18 гадзін на чацвёртым паверсе галоўнага корпуса адкрыецца фестываль мастацкай творчасці замежных студэнтаў. У праграме фестывалю — урачыстае адкрыццё выстаўкі палітычнага плаката, карцін і стэндаў, канцэрт, падрыхтаваны замежнымі студэнтамі, якія навучаюцца ў БДУ імя У. І. Леніна. Запрашаем усіх жадаючых!

КЛУБ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛЬНАЙ ДРУЖБЫ УНІВЕРСІТЭТА, САВЕТ ДРУЖБЫ, ІНТЭРСЕКТАР КАМІТЭТА КАМСАМОЛА УНІВЕРСІТЭТА.

# З АЛІМПІЙСКІМ ПРЫЦЭЛАМ




### 5 КРАСАВІКА—80 ГАДОЎ З ДНЯ ПАЧАТКУ СУЧАСНЫХ АЛІМПІЙСКІХ ГУЛЬНЯЎ

1976-ы — год алімпійскі. Адбыліся ўжо XII зімовыя Алімпійскія гульні ў Інсбруку, у ліпені канадскі горад Манрэаль прыме XXI летнюю Алімпіяду. Сілы, магчымасці, творчасць спартсменаў дасягаюць кульмінацыі. Алімпійскі год дорыць нам рэкорды, новыя таленты, незабыўныя імгненні вострай і прыгожай спартыўнай барацьбы.

Алімпійскі год — сур'ёзнае выпрабаванне і для спартсменаў нашага універсітэта. Хто сёння з'яўляецца спартыўным гонарам нашай ВНУ?

Мы маем кандыдатаў у алімпійскую зборную каманду Савецкага Саюза. Гэта Л. Рунцо, Л. Клімянцёнак, Т. Шляхто, Л. Кайгародава.

**ЛЮБОЎ РУНЦО** — выкладчыца кафедры англійскай мовы гуманітарных факультэтаў. Удзельнічала ў Алімпійскіх гульнях у Мюнхене, дзе бегла ў эстафеце 4×400 м.

**ЛАРЫСА КЛІМЯНЦЁНАК** (біяфак) займаецца скачкамі ў вышыню 7 гадоў. На VI Спартакіядзе народаў СССР была пятай. Яе лепшы вынік — 181 см. Цяпер Ларыса настойліва трэніруецца і хоча як мага лепш выступіць у адборачных спаборніцтвах.

**ТАЦЦЯНА ШЛЯХТА** (мехмат) стала ў апошні час адной з мацнейшых спартсменак Савецкага Саюза па скачках у вышыню. Зусім нядаўна яна выступала за зборную краіны на чэмпіянаце Еўропы 1976 года ў закрытых памяшканнях (Мюнхен).

**ЛЮДМІЛА КАЙГАРОДАВА** (супрацоўнік гістфака) — майстар спорту СССР па лёгкай атлетыцы. У скачках у даўжыню ў яе добры вынік — 640 см. Людміла — удзельніца ўсесаюзных і міжнародных спаборніцтваў.

У полі зроку трэнераў зборнай Савецкага Саюза баскетбаліст **АЛЯКСЕЙ ШУКШЫН** (выкладчык кафедры фізвыхавання). Ён валодае каштоўнай якасцю —умела дзейнічае ў абароне.

Калі б водныя лыжы былі ўключаны ў праграму Алімпіяды, то першым кандыдатам у каманду краіны ў гэтым відзе спорту мы назвалі б студэнтку фізфака, майстра спорту міжнароднага класа **ІНЭСУ ПОТЭС**. Пра яе ў нумары за 12 лістапада 1975 года пісаў «Савецкі спорт»: «Інэса Потэс, абсалютная чэмпіёнка краіны 1973 і 1975 гадоў, неаднаразовая рэкардсменка ў фігурным катанні, самая працавітая вучаніца Наважылава, акуратная і падцягнутая ва ўсім... У кожным калектыве ёсць людзі, якія, не ведаючы пра гэта, ужо самім сваім існаваннем у ім вызначаюць яго твар. У «Алімпіі» (Мінскі клуб воднальжнікаў) Потэс — адна з такіх людзей».

У дзесятку лепшых спартсменаў універсітэта ўваходзіць **УЛАДЗІМІР ЗАЙДЭЛЬ** (ФПМ). Уладзімір — уладальнік Кубка СССР і чэмпіён краіны сярод юнакоў па міжнародных шашках.

11 гадоў прысвяціла мастацкай гімнастыцы майстар спорту **ЛАРЫСА ВАРАБ'ЁВА** (юрфак). На Кубку краіны 1974 года ў саставе зборнай БССР Ларыса стала бронзавым прызёрам. Удзельнічала ў міжнароднай сустрэчы Беларусь — Польшча. На пытанне «Што ў спартсменаў вы цэніце больш за ўсё?» дзяўчына коратка адказала: «Характар».

Добра выступаюць у самых адказных спаборніцтвах шахматыстка Т. Косціна (ФПМ), лёгкаатлет Б. Лютарэвіч (супрацоўнік фізфака), фехтавальшчыца Т. Дронь (гістфак), барэц В. Харук (геафак), баскетбалісткі Н. Анікіна (гістфак) і Л. Жабінская (геафак), валейбалістка І. Жыдзелева (ФПМ), цяжкаатлет А. Гусеў (фізфак) і іншыя.

Як бачна, спартсмены універсітэта сустрэлі алімпійскі год ва ўсеўзбраенні. Дасягнуты пэўныя поспехі, ёсць сілы і магчымасці да пакарэння новых вышынь. Спадзяёмся, што нашы спартсмены яшчэ неаднаразова парадуюць нас сваім майстэрствам.

З. РУСАКОВІЧ.

Што такое гумар? Непрафесіяналы мяркуюць, што гумар — гэта тое, што смешна. Прафесіяналы сцвярджаюць, што гумар — тое, што нараджаецца ў муках.

Часам насценгазеты «Решим любую задачу» і «Алгоритм» жартуюць удачна, часам не вельмі. Бывае, жарты, парушаючы аўтарскія правы, перадрукоўвае «Литературная газета». Некаторыя жарты становяцца крылатымі выразамі на мехмаце і ФПМ.

Сёння гумар «РЛЗ» і «Алгоритма» — на нашай старонцы.




# МЯСЦОВАЯ ХРОНІКА

### ВІДАВОЧНАЕ — НЕВЕРАГОДНАЕ

Як паведамляюць, на століках хімфакаўскай сталовай паявіліся салфеткі. Непаразуменне ўдалося ліквідаваць у найкарацейшы тэрмін, нягледзячы на вялікую колькасць цікаўных.

### ЗДАРЭННЕ

Учора ў інтэрнаце № 2 працаваў ліфт. Прычына здарэння не выяўлена.

### У СВЕЦЕ ГЕАМЕТРЫІ

Трэці год працягвае каціцца па нахільнай плоскасці Цімафей С. Адпаведныя органы зацікавіліся гэтым...

### РЭКЛАМА

Для любіцеляў добра паабедаць з наступнага тыдня штодзённа будзе трансліравацца каляровая тэлеперадача «Ешце з намі, ешце, як мы, ешце лепш за нас».

### ГЭТА ЦІКАВА

Пакой № 1313 інтэрната № 6 праводзіць смелы эксперымент, які дасць магчымасць хутка заявіць, што да канца гэтага года ўсе студэнты будуць забяспечаны інтэрнатам.

Як нам паведамілі, у гэтым пакоі жыве ўжо 15 чалавек, не лічачы чатырох «зайцоў».

### НАЗІРАННІ НАТУРАЛІСТА

Вясна... Уся прырода абуджаецца ад зімовай спячкі... Студэнт Пеця Ф. здаў першы «хвост» за мінулую сесію.

### НАВУКА І РЭЛІГІЯ

Студэнт Вася Ч. ішоў на экзамен па навуковаму атэізму. Перад уваходам ва універсітэт дарогу яму перабегла чорная кошка...

Экзамен ён не здаў.

# ПРАЦОЎНЫ ДЭСАНТ

Сяджу я ў «чыталцы», гартаю спакойна Калмагорава з Фаміным, як раптам прыбягае Ігар і крычыць шэптам:

— Ты чаго тут рассеўся! Працоўны дэсант у тры гадзіны. Трэба Ваньку і Сяргея шукаць, а то начальства адразу здагадаецца, што яны на лекцыі не былі.

Знайшлі Ваську і Лёшку.
— А, — кажа Лёшка,— гэта ў Шчомысліцах. Быў я у фізікаў у інтэрнаце. Там у іх нейкае БМУ канавы ніяк не можа выкапаць. А фізікі выдатныя палацёры з экскаватараў нарабілі.

— А я вось газету нядаўна чытаў, калі палітінфармацыю рыхтаваў. Там адпачываць ад вучобы працай фізічнай вучаць. Эх, і адпачнем мы з вамі!

Прыбылі на месца, а там адпачынак кіпіць поўным ходам.

Сцягнуў я ў Каці Зяленскай рыдлёўку і таксама падключыўся. Махаю прыладай гэтай, радуюся: глеба глiністая, надвор'е няжаркае. Падбягае Ванька, вырваў рыдлёўку.

— Другая змена! — крычыць. — Другая змена!

Так і быць, для сябра не шкада.

Ды толькі не давялося адпачыць нам як след. Падагналі аўтобусы, павезлі нас дамоў. І правільна зрабілі. Так адпачываючы і абляніцца нядоўга, а заўтра кантрольная.

# ТЛУМАЧАЛЬНЫ СЛОЎНІК «АЛГОРИТМА»

*Прысвячаецца першакурснікам, якія лічаць сябе унікумамі; другакурснікам, за якіх лічаць машыны; трэцякурснікам, якія лічаць, што «4» —гэта добра, а здароўе — лепш; чацвёртакурснікам, якія падлічваюць свой сярэдні бал, і пяцікурснікам, якіх лічаць студэнтамі толькі ў дэканаце.*

**АБІТУРЫЕНТ** — у большасці кволая істота з дрыжыкамі ў голасе і каленях. Абітурыент яшчэ не адурманен ведамі, таму добра разбіраецца ў законах Ньютана і табліцы множання.

**ВАЕНКА** — хто не ведае — не зразумее, хто ведае — скаланецца.

**ЗАЛІКОЎКА** — кніжка для збірання аўтографаў выкладчыкаў. Асобам, якія сабралі поўны камплект, у абмен на залікоўку выдаецца дыплом.

**«ЗДАВАЛЬНЯЮЧА»** — адзнака; выкладчыкамі трактуецца, як «ну, добра, вось вам «тры» і каб больш я вас не бачыў»; студэнтамі — як «пранесла». Мае цудоўную якасць: і не тое, каб вам, і не тое, каб нам. Зберагае здароўе.

**КАНСПЕКТ** — у час сесіі прыроўніваецца да золата. На старэйшых курсах становіцца рэдкасцю і каштоўнасцю.

**ЛЕКЦЫЯ** — адзін са сродкаў правядзення студэнтамі свайго вольнага часу. Уступае па відовішчнасці кіно і па карыснасці — сну. Дае магчымасць авалодаць у дасканаласці ўсімі тонкасцямі крыжыкаў - нулікаў і марскога бою.

**РАЗМЕРКАВАННЕ** — масавая гульня. Яе правілы: студэнту прапаноўваецца шэраг незразумелых назваў, з якіх ён, кіруючыся нейкай тактыкай, выбірае адну. Прынцып выбару тактыкі не ўказваецца. Хто выйграў, выяўляецца праз некалькі год.

**СТЫПЕНДЫЯ** — адзін з правераных сродкаў прыцягнення студэнтаў да заняткаў. Устаноўлена, што 16 чысла кожнага месяца сярэдні працэнт наведвання заняткаў амаль 200.

**ЭКЗАМЕН** — у вузкім сэнсе пад экзаменам разумеецца мінi-матч «выкладчык — студэнт», які праводзіцца дэканатам для выяўлення умення студэнтаў карыстацца падручнымі сродкамі, а таксама для азнаямлення выкладчыка з асабовым саставам курса. У адрозненне ад спартыўных матчаў паўторна экзамен праводзіцца не ў выніку нічыёй, а ў выпадку паражэння студэнта. Задача апошняга таму — дабіцца хаця б нічыёй.

# УСМЕШКІ МАСТАКА





З 16 па 22 сакавіка ў Магілёве праходзіла студэнцкае першынство Беларусі па фехтаванню, на якім паспяхова выступіла каманда нашага універсітэта, заняўшая другое месца пасля інстытута фізічнай культуры. У асабістых спаборніцтвах вылучылася заняўшая 1 месца ў фехтаванні на рапірах сярод жанчын студэнтка IV курса гістфака Таццяна Дронь. (Фота злева).

Агульнаму поспеху садзейнічала роўнае выступленне ў камандных спаборніцтвах: жанчыны занялі 1 месца, мужчыны—рапірысты і шпажысты — 2 месца, саблісты — 3 месца.



Шпажысты і рапірысты універсітэта, заняўшыя другое месца, кандыдаты ў майстры спорту: С. Міруценка (фізфак), С. Мяснікоў (юрфак), С. Ягорцаў (журфак), У. Парткоў (хімфак), А. Абухоўскі (біяфак) і майстар спорту С. Барадзін (юрфак). Фота В. ХРЭНАВА.

«Белорусский университет» — орган парткома, ректората, месткома, комитета комсомола и профкома Белорусского ордена Трудового Красного Знамени государственного университета им. В. И. Ленина. На белорусском языке.

Газета выходзіць па чацвяргах. Тыраж 2.000 экз. Аб'ём — 1,5, друк. ар. АТ 04155 Заказ № 463.

В. а. рэдактара В. Д. РОШЧЫН.

Наш адрас: Мінск, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19. Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга друкарня выдавецтва ЦК КП Беларусі.